За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 10 (93) Кастрычнік 2014 г.

КДК Віцебскай вобласьці ня стаў на просьбу апазыцыянэра караць чыноўнікаў



Леанід Аўтухоў

Віцебскі абласны кіраўнік партыі БНФ Леанід Аўтухоў зьвярнуўся ў Камітэт дзяржкантролю з заявай аб прыцягненьні да адміністрацыйнай адказнасьці шэрагу службовых асоб. На думку Аўтухова, начальнік Гарадоцкага аддзелу занятасьці Галіна Сталярова і начальнік Гарадоцкага вузла паштовай сувязі Людміла Камякова парушылі яго правы і законныя інтарэсы, даўшы яму наўмысна скажоную інфармацыю. КДК распачынаць адміністрацыйны працэс у дачыненьні згаданых службовых асоб адмовіўся...

Леанід Аўтухоў зьвярнуўся ў дзяржкантроль пасьля таго, як няўдала паспрабаваў скарыстацца з паслугаў службы занятасьці. Хаця напачатку пэрспэктывы працаўладкавацца праз гэтую службу выглядалі аптымістычна: зьвярнуўшыся туды, Аўтухоў атрымаў накіраваньне на працу ў якасьці кіроўцы аўтамабіля на пошту. Таксама яму было выдадзенае накіраваньне на мэдычны агляд.

«Усе неабходныя працэдуры па згаданых накіраваньнях я добрасумленна выканаў. Пры гэтым аплаціў праезд і змарнаваў асабісты час. Насамрэч высьветлілася, што вышэйназваная вакансія адсутнічае», — распавёў Леанід Аўтухоў.

«Мяркую, што службовая асоба Сталярова Г.Л. наўмысна дала мне скажоную інфармацыю пра наяўнасьць у Гарадоцкім раённым вузьле паштовай сувязі ўнітарнага прадпрыемства "Віцебскаблпошта" вакансіі кіроўцы аўтамабіля, — напісаў ён у Камітэт дзяржкантролю. — *Таксама мяркую, што службовая асоба Камякова Л.М. наўмысна дала мне скажоную інфармацыю пра адсутнасьць вакансіі. Сваімі дзеяньнямі Сталярова Г.Л. і Камякова Л.М. парушылі мае правы, у прыватнасьці права на працу і працаўладкаваньне з дапамогай дзяржавы, якія гарантаваныя мне артыкулам 41 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і іншымі дзейнымі законамі краіны».*

Паводле лёгікі партыйнага актывіста, прынамсі адна зь дзьвюх начальніц, наконт якіх ён зьвярнуўся ў КДК, падманула яго, чым парушыла адміністрацыйны кодэкс. Бо адна сьцьвярджала, што ёсьць вакансія, а другая — што гэтай вакансіі няма. Таму кагосьці зь іх трэба было прыцягнуць да адказнасьці. Аднак у Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласьці палічылі па-іншаму.

Першы намесьнік старшыні камітэту Вадзім Заранкін паведаміў Аўтухову, што падставы для пачатку адміністрацыйнага працэсу адсутнічаюць: «Ня выяўлена доказаў, якія сьведчаць пра незаконнасьць дзеяньняў названых службовых асоб, а таксама пра наяўнасьць намеру ў скажэньні інфармацыі».

«Таксама інфармуем пра тое, што згодна з артыкулам 9.6 КаАП прыцягненьне службовай асобы да адміністрацыйнай адказнасьці магчымае ў выпадку адсутнасьці ў яго дзеяньнях складу злачынства. Такім чынам, пытаньне аб прыцягненьні да адміністрацыйнай адказнасьці паводле артыкулу 9.6 КаАП можа разглядацца толькі пры наяўнасьці пастановы органу крымінальнага перасьледу аб адмове ва ўзбуджэньні крымінальнай справы паводле артыкулу 204 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь», — дадаў намесьнік старшыні Камітэту дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласьці.

Вось жа, як вынікае з паперы, атрыманай з КДК, скажэньне інфармацыі чыноўнікамі сапраўды мела месца. Але пры гэтым быццам бы ніхто не вінаваты. Цікава, а калі б гаворка вялася пра парушэньне адміністрацыйнага кодэксу кімсьці з апазыцыянэраў, да яго паставіліся б гэтаксама лагодна? Выходзіць, закон што дышаль?

Віцебскі абласны суд ня ўзяў пад увагу высновы Міністэрства інфармацыі

У Віцебскім абласным судзе адбыўся разгляд скаргі Тацьцяны Сячко. Жыхарку Воршы аштрафавалі за распаўсюд улётак пра "Народны рэфэрэндум", абвінаваціўшы яе ў парушэньні заканадаўства пра СМІ. Міністэрства інфармацыі пацьвердзіла, што ўлёткі да СМІ не належаць, але абласны суд ня ўзяў гэта пад увагу.

Тацьцяна Сячко была затрыманая 12 жніўня падчас распаўсюду ўлётак па паштовых скрынях. Пасьля затрыманьня спадарыню адпусьцілі без складаньня пратаколу, але праз тыдзень, 20 жніўня, пратакол пра правапарушэньне ўсё ж быў складзены намесьнікам начальніка аддзелу аховы і прафіляктыкі правапарадку Сяргеем Бязьлюдавым. Ён кваліфікаваў дзеяньні актывісткі паводле артыкулу 22.9 КаАП — як парушэньне заканадаўства пра СМІ.

11 верасьня ў аршанскім судзе адбыўся разгляд адміністрацыйнай справы. Судзьдзя Алеся Драунькова пагадзілася з высновамі супрацоўніка міліцыі і пастанавіла аштрафаваць спадарыню. Такім чынам, "за парушэньне заканадаўства аб СМІ" распаўсюдніца ўлётак атрымала штраф памерам 40 базавых велічынь.

"Гэта блізка да "верхняе планкі", бо паводле артыкулу 22.9 прадугледжаны штраф ад 20 да 50 базавых велічынь, — падкрэсьлівае аршанскі актывіст кампаніі "Гавары праўду" Алесь Шутаў. — Убачыўшы такое, мы вырашылі зьвярнуцца ў Міністэрства інфармацыі. Бо ўлёткі — гэта ніяк ня СМІ, і пакараньне, ды такое жорсткае, выглядае беспадстаўным".

У адказ на запыт аршанскіх актывістаў зь Міністэрства інфармацыі прыйшоў ліст, падпісаны намесьнікам міністра Ўладзімерам Матусевічам. У лісьце было сказана, што "згодна з ГОСТ 7.60-2005 "Выданьні. Асноўныя віды.Тэрміны і вызначэньні" і тэхнічных умоваў BY 100083317.002-2007 дасланая вамі друкаваная прадукцыя зьяўляецца непэрыядычным выданьнем і, адпаведна, не зьяўляецца сродкам масавай інфармацыі".

Ліст зь Міністэрства інфармацыі Тацьцяна Сячко ўзяла з сабой на разгляд скаргі ў Віцебскім абласным судзе. На яе хадайніцтва судзьдзя абласнога суду Сьвятлана Іванова далучыла гэты ліст да судовай справы, аднак на вынік ён не паўплываў.

"Судзьдзя аблсуду не скасавала рашэньня суду першай інстанцыі, нягледзячы на тлумачэньні намесьніка міністра інфармацыі пра тое, што ўлёткі — гэта ня СМІ, і, адпаведна, распаўсюд ўлётак нельга лічыць парушэньнем заканадаўства аб СМІ", — распавёў прысутны на разглядзе Алесь Шутаў.

Актывіст лічыць, што высновы судзьдзі абласнога суду трэба аспрэчваць у скарзе да старшыні Віцебскага абласнога суду. І што відавочным у гэтай справе зьяўляецца перасьлед Тацьцяны Сячко за грамадзкую актыўнасьць. Яна распаўсюджвала ўлёткі пра "Народны рэферэндум" паводле ўласных перакананьняў, мець якія — законнае права любога грамадзяніна. Гэтаксама як права на непрадузяты незалежны суд, якое ў дачыненьні да Тацьцяны Сячко таксама было парушанае, лічыць Алесь Шутаў.

У Віцебску — чарговая забарона пікетаў

Сябру КХП БНФ Яну Дзяржаўцаву зноў адмовілі ў правядзеньні двух пікетаў салідарнасьці з Украінай. Гэта ўжо другая забарона акцыяў аднолькавай тэматыкі, і актывіст хоча прыцягнуць да адказнасьці прадстаўнікоў арганізацыяў, якія мусяць займацца "абслугоўваньнем акцыяў".

"17 кастрычніка мы плянавалі акцыю салідарнасьці з Украінай у парку Мазурына, 20 кастрычніка — у Парку культуры і адпачынку чыгуначнікаў. Адміністрацыі Чыгуначнага і Кастрычніцкага раёнаў, куды мы зьвярталіся, дазволаў не далі. Мэтай мерканых акцыяў было публічнае асуджэньне агрэсіі Расеі ў дачыненьні да незалежнай сувэрэннай Украіны. Аднак і ня гэта самае істотнае: забароны акцыяў, чаму б яны ні былі прысьвечаныя, працягваюцца ў Віцебску ўжо пяты год. І пяты год, згодна з рашэньнем Віцебскага гарвыканкаму №881, парушаюцца нашы грамадзянскія правы".



Ян Дзяржаўцаў

Мінулым разам актывісты КХП БНФ атрымалі адмовы ад чыноўнікаў месяц таму. Прычына адмоваў у тым, што партыйцы не заключылі дамовы на абслугоўваньне акцыяў з ЖКГ, мэдыкамі цэнтральнай гарадзкой палікінікі і міліцыяй, якіх раённыя чыноўнікі патрабуюць на падставе рашэньня Віцебскага гарвыканкаму ад 10 ліпеня 2009 году "Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Віцебску".

"Ні зь міліцыяй, ні з цэнтральнай гарадзкой палікінікай заключыць дамовы не ўдалося ні разу. Сытуацыя настолькі несправядлівая, што я пайшоў на экспэрымэнт: вырашыў заключыць дамовы толькі для пікету ў Чыгуначным раёне, а ў Кастрычніцкім — проста падаў заяўку. Вынік аднолькавы: забаронены абедзьве акцыі. Бо дамову пагадзіліся заключыць толькі камунальнікі — прадпрыемства "Віцебскі зелянбуд". Зь міліцыі адказалі, што будуць заключаць дамову толькі пасьля таго, як нам дадуць дазвол раённыя ўлады — гэтак напісана і ў законе аб масавых мерапрыемствах, але ж у рашэньні нашага гарвыканкаму — усё наадварот. А з палікінікі прыйшла стандартная адпіска, якая выглядае на сапраўдны зьдзек: маўляў, мы ня можам заключаць папярэдне дамовы, бо ня ведаем, якая будзе сытуацыя з захворваньнямі у названы дзень, раптам яна будзе крытычная", - распавёў Ян Дзяржаўцаў.

Такім чынам, лічыць апазыцыянэр, дзяржаўныя структуры парушаюць рашэньне гарвыканкаму, дзе яны згаданыя ў якасьці адказных за абслугоўваньне акцыяў. Таму ён зьбіраецца падаць заяву ў суд супраць галоўурача палікінікі, які падпісвае лісты з адмовамі ад супрацоўніцтва. А таксама рыхтуе зварот у Міністэрства унутраных спраў, каб там патлумачылі сытуацыю. І далі рэкамэндацыю, як дзейнічаць, калі абласная ўправа МУС не выконвае патрабаваньняў рашэньня гарвыканкаму.

Насамрэч сытуацыя крытычная: рашэньне Віцебскага гарвыканкаму № 881 сфармуляванае такім чынам, што сталася невыканальным, і ўжо за 5 гадоў віцебскія актывісты не змаглі атрымаць ніводнага дазволу на акцыі любога фармату. Тым часам за ўдзел у несанкцыянаваных акцыях, да ўдзелу ў якіх практычна і падштурхоўвае невыканальнае рашэньне, актывісты атрымлівалі адміністрацыйныя пакараньні.

Павал Левінаў дэманструе абсурднасьць рашэньня Віцебскага гарвыканкаму аб масавых мерапрыемствах

Праваабаронца Павал Левінаў праінфармаваў Віцебскі гарвыканкам аб правядзеньні адзінаасобнага вулічнага шэсьця. У якасьці маршруту ён пазначыў дарогу ад свайго дому да крамы "Віцебскія прадукты". І атрымаў пісьмовую забарону на падставе таго, што ня выканаў патрабаваньняў рашэньня гарвыканкаму "Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску".

"Заяўка ў гарвыканкам была пададзеная, бо мой маршрут у краму праходзіць па тэрыторыі двух раёнаў — Кастрычніцкага і Першамайскага. А забарону я атрымаў, бо не заключыў дамоваў на абслугоўваньне маёй адзінаасобнай акцыі супрацоўнікамі міліцыі, паліклінікі і службы ЖКГ. Больш абсурд уявіць цяжка: гарвыканкам патрабуе, каб я ішоў у краму ў суправаджэньні міліцыянта, урача і дворніка зь мяцёлкай. Бо ў рашэньні гарвыканкаму "Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску" гаворыцца, што заяўнікі, каб атрымаць дазвол на нейкую акцыю, мусяць разам з заяўкай падаваць і дамовы, заключаныя з цэнтральнай гарадзкой паліклінікай, міліцыяй і прадпрыемствам ЖКГ. У той самы час гарадзкія ўлады прадэманстравалі і ўласнае няведаньне заканадаўства: каб акцыя лічылася масавым мерапрыемствам, у ёй павінны узяць удзел прынамсі 2 чалавекі. Я ж зьбіраўся ісьці адзін. Значыцца, маё шэсьце пад заканадаўства аб масавых акцыях не падпадае наогул", — тлумачыць праваабаронца.



Павал Левінаў

Павал Левінаў падрыхтаваў заяву ў суд наконт забароны адзінаасобнага шэсьця. Там напісана, што гарвыканкам парушае ягонае права на правядзеньне акцыяў. Праваабаронца лічыць, што патрабаваньні рашэньня гарвыканкаму №881 невыканальныя — адпаведна, трэба прадэманстраваць уладам абсурднасьць такіх дакумэнтаў:

"За апошнія 5 гадоў, з часу прыняцьця гэтага рашэньня, у Віцебску не было дазволена ніводнай акцыі з ініцыятывы мясцовых актывістаў. Бо міліцыя і паліклініка адмаўляюцца заключаць дамовы з заяўнікамі, спасылаючыся на розныя прычыны. Таму я імкнуся прадэманстраваць, што з такім падыходам пад парушэньне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах можна падвесьці ўсё што заўгодна, у тым ліку пэрсанальны паход у краму. Няхай віцебскія ўлады ведаюць, што іхныя высілкі выглядаюць сьмешна і не выклікаюць павагі ў грамадзян".

Нагадаем, спроба давесьці сытуацыю з масавымі акцыямі да абсурду ўжо ня першая ў Паўла Левінава. Раней ён падаваў заяўку ў Чыгуначную раённую адміністацыю, каб правесьці сход грамадзян у лазьні. Высьветлілася, і там зьбірацца кампаніямі нельга: праваабаронцу адказалі, што і ў гэтым выпадку трэба заключаць дамовы з мэдыкамі, супрацоўнікамі ЖКГ і міліцыяй.

Павал Левінаў перакананы, што ўмовы атрыманьня дазволу на масавыя мерапрыемствы ў Віцебску трэба мяняць, бо яны невыканальныя. Гэтую праблему спрабуюць вырашыць і віцебскія партыйцы — яны неаднаразова судзіліся за забароненыя акцыі, патрабавалі зьмяніць рашэньне віцебскага гарвыканкаму №881, зьвяртаючыся ў самыя розныя інстанцыі. Аднак адусюль адказваюць, што яно прайшло юрыдычную экспэртызу, унесенае ў рэестар прававых актаў, і таму нібыта абсалютна бездакорнае.

Судовая калегія Віцебскага абласнога суду адмовіла рабочаму ААТ «Полацак-Шкловалакно» ў судовай абароне



Віктар Стукаў

Пазоў аб ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненьні да рабочага шклозаводу Віктара Стукава, кіраўніка пяршоўкі незалежнага прафсаюзу, ужо паўтара году адмаўляюцца разгледзець па сутнасьці ў беларускіх судох. Ужо адбылося шэсьць судовых адмоваў у разглядзе пазову аб дыскрымінацыі — ад Полацкага раённага да Вярхоўнага судоў, — хоць у Працоўным кодэксе сказана: «Асобы, якія лічаць, што яны падвергліся дыскрымінацыі ў сфэры працоўных адносін, маюць права зьвярнуцца ў суд з адпаведнай заявай аб ліквідацыі дыскрымінацыі».

Пасьля скаргі рабочых аб дыскрымінацыі і парушэньні Указу ў адміністрацыю прэзыдэнта, для адказу рабочым скарга была перапраўленая ў Міністэрства працы, якое настойвала, што гэтая працоўная спрэчка павінна разглядацца ў судзе. Рабочым была зробленая спроба разгледзець працоўную спрэчку па наноў адкрытых абставінах, бо скончыўся тэрмін паўнамоцтваў камісіі па калектыўных перамовах заводу «Полацак-Шкловалакно», якая магла зьмяніць калектыўную дамову. Але суды ўпарта адмаўляюцца разгледзець пазоў аб дыскрымінацыі ў працоўных адносінах.

Нават калектыўны зварот працоўных заводу «Шкловалакно» ў Канстытуцыйны суд у лістападзе 2013 году са скаргай на дыскрымінацыю не падзейнічаў. Канстытуцыйны суд ня стаў разглядаць нормы калектыўнай дамовы ААТ «Полацак-Шкловалакно» на адпаведнасьць Канстытуцыі. Рабочыя лічаць, што ў калдамове парушаныя не толькі Працоўны кодэкс Беларусі, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, але і Указ Прэзыдэнта аб роўных сацыяльных гарантыях для працоўных адной прафэсіі, а таксама міжнародныя забавязаньні краіны па выкананьні правоў грамадзян.

Судовая калегія Віцебскага абласнога суду таксама адмовіла Віктару Стукаву ў задавальненьні ягонага хадайніцтва аб ініцыяваньні звароту ў Канстытуцыйны суд наконт неадпаведнасьці калектыўнай дамовы Канстытуцыі Беларусі. Чаго тады вартыя словы Канстытуцыі: «Кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны»?

Рабочыя заводу не спыняюць барацьбы за свае правы і законныя інтарэсы. Зараз скарга спадара Стукава разглядаецца ў Віцебскай абласной пракуратуры ў парадку нагляду. У абавязкі пракуратуры ўваходзіць сачыць за выкананьнем правоў грамадзян у іх адносінах з рознымі арганізацыямі. Пракуратура прадстаўляе дзяржаву, а «Дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі забавязаньнямі дзяржавы», — гаворыцца ў Канстытуцыі Беларусі...

Палітвязень Ігар Аліневіч выйшаў з ШЫЗА пасьля 30 сутак



Ігар Аліневіч

Палітвязень Ігар Аліневіч правёў у ШЫЗА Віцебскай калёніі 30 сутак. Ён быў пакараны штрафным ізалятарам за адмову мыць месцы агульнага карыстаньня.

Бацькі палітвязьня, Валянціна і Ўладзімер, атрымалі спатканьне з сынам, які нядаўна сустрэў свой чацьвёрты дзень народзінаў у турме. Спатканьне доўжылася паўтары гадзіны - праз шкло і тэлефон. Ранейшае спатканьне адбылося яшчэ ў чэрвені. Маці палітвязьня распавяла, як ён трымаецца і ў якіх умовах яго ўтрымліваюць.

- Агульнае ўражаньне - па-першае, радасьць ад таго, што ён жывы, а па-другое, пачуцьцё, што сорамна расслабляцца і ламаць рукі і пакутаваць, калі ў нас яшчэ ёсьць такія мужчыны як ён. Мне пашанцавала, што я аказалася ягонай маці. Я проста глядзела на яго і дзівілася: ён абсалютна спакойны і глядзіць на ўсё гэта нават зь нейкім гумарам.

Вядома, усё, што зь імі робяць - гэта страшна. Мне часам задаюць такія пытаньні накшталт: «А дзе сядзяць усе нашы палітвязьні?». Людзі думаюць, што для іх створана спэцыяльнае месца, дзе яны камфортна жывуць і знаходзяцца ўсе разам. Я хачу сказаць, што нават за савецкімі часамі палітычных трымалі ў адным лягеры, і такіх вось зьдзекаў як парушэньне гуманных умоў утрыманьня, як гэта адбываецца цяпер, я ня памятаю.

Цяпер кожны сядзіць асобна - або ў калёніі, або ў турме. Калі ў калёніі, дык над кожным вісіць пагроза таго, што ў кожны момант умовы могуць стаць больш жорсткімі і ператварацца ў сапраўднае пекла абсалютна без усялякіх на тое падстаў.

Справа ня толькі ў Ігару. Усе тыя, хто нядаўна выйшаў са зьняволеньня, - тыя ж Севярынец, Дашкевіч, Аўтуховіч - яны, нягледзячы на тое, што зь імі твораць, ня падаюць духам. Зь імі калі пагутарыш, такое ўражаньне, як быццам жывой вады глытнеш. Гэта сапраўды сьветлыя людзі. Ігар ніякіх выклікаў сыстэме ня кідае - ён проста захоўвае спакой. І успамінаючы гісторыю - Хадаркоўскага, Салжаніцына - я бачу, што адны і тыя ж умовы могуць чалавека зламаць, а могуць наадварот зрабіць чалавека лепш.

- Як Ігар пераважыў 30 дзён у камэры-адзіночцы?

- Я ў яго пытаюся: «Ігар, ну як жа так, трыццаць дзён у адзіночцы, бяз кніг, без паперы і асадкі, наогул безь нічога!». Там жа было так: ложак, на якім ён сьпіць, а 5-й раніцы падымаецца і ты ня можаш больш легчы, гэта значыць проста ня можаш выспацца, таму што класьціся забаронена - гэта парушэньне правілаў. А ён адказвае: «Нічога, так нават лепш. Няма магчымасьці расслабіцца. Я шмат пра што перадумаў». Я пытаюся ў яго: «А што ты рабіў?». А ён адказвае: «Часта ізаляцыя - наадварот нават добра для таго, каб упарадкаваць думкі і абдумаць важныя ў жыцьці рэчы». Вершы чытаў, кажа. Пыталася ў яго, ці абдумвае ён сюжэт новай кнігі, але ён сказаў, што ўсё, што ён хацеў напісаць на гэтую тэму, ужо напісаў у кнізе «Еду ў Магадан».

- Што яго радуе і падтрымлівае ў гэты цяжкі час?

- Два гады таму нам перадалі ад колішніх польскіх палітвязьняў доўгі цёплы шалік. І Ігар хаця і ня ведаў, што гэта за шалік, а адразу павесіў сабе на плечы, і зь любоўю яго пагладжваў. А я яму кажу: «А ты ведаеш, хто табе яго перадаў?». І ён калі даведаўся, вельмі ўсьцешыўся: для яго салідарнасьць людзей вельмі шмат значыць. Цяпер ён зноў быў у гэтым шаліку, ён для яго проста нейкі талісман цяпер. Я нават ня ведаю, што за людзі перадалі яму тады шалік, але, магчыма, яны шануюць тут тое, што гэтая рэч трапіла па прызначэньні і сапраўды адыгрывае сваю ролю, грэючы яго і фізычна, і душэўна у гэты халодны час.

- Вы не баяліся, што спатканьне сарвецца?

- Калі мы ехалі, мы ня ведалі, дадуць нам спатканьне ці не. Рашэньне магло быць адмененае ў кожную хвіліну.

- Ці атрымалася ў вас перадаць яму нейкія цёплыя рэчы і прадукты?

- Мы завезьлі яму і прадуктовую, і рэчавую перадачу. З тых часоў, як яго перавялі ў іншую калёнію, ён нават ня меў прадметаў гігіены - іх папросту не давалі. Дзіўна, што не ўзялі тэпцікі і тазік. Але ў кожнай калёніі - свае правілы.

- Што кажа Ігар пра ўмовы ўтрыманьня ў калёніі?

- Ён кажа, што ў іхнай калёніі рэжым з кожным днём становіцца больш жорсткім. Ня толькі ў дачыненьні да яго, а наогул. Нават для таго, каб патэлефанаваць - а яму за паўгода далі толькі адно тэлефанаваньне - зараз трэба пісаць заяву, зьбіраць подпісы і гэтак далей. Як ён казаў у сваёй кнізе: мінулага ўжо няма, будучыня прывідная, а ёсьць толькі тут і цяпер. Для нас гэтае спатканьне было тут і цяпер, і гэта была вялікая радасьць, што мы ўбачылі яго жывым і здаровым.

Нагадаем, 27 траўня 2011 году судзьдзя Заводзкага раёну Менску Жанна Хвайніцкая асудзіла Ігара Аліневіча на 8 гадоў пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Цяпер ён адбывае пакараньне ў Віцебскай калёніі. Яго, а таксама Мікалая Дзядка і Аляксандра Францкевіча абвінавацілі ў арганізацыі шэсьця каля будынку Мінабароны, нападзе на казіно «Шангры Ла» і ізалятар на Акрэсьціна, а таксама падпале дзьвярэй філіялу «Беларусбанку».

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.